ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 909.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 263 (1230) | СУБОТА, 15-га лістапада 1930 г.

Комсамольцы—у вайсковыя школы

МАСКВА, 13. ЦК УсеЛКСМ прапанаваў усім мясцовым арганізацыям разгарнуць у „Дэкаду абароны“ вэрбоўку комсамольцаў у ваенныя школы. У „дэкаду абароны“ пры шмат якіх ваенных школах адчыняюцца 6 месячныя і гадовыя падрыхтоўчыя курсы.

У паход за тэхнікай

МАСКВА, 13. У „Дэкаду абароны“ ў часьцях Чырвонай арміі праводзіцца масавы паход за азнаямленьне з новай тэхнікай. Ячэйкі ТДА-Авіяхэму разгорнуць работу ў часьцях па папулярызацыі тэхнікі сярод чырвонаармейцаў і па азнаямленьню шырокіх мас працоўных з тэхнікай Чырвонай арміі. У шмат якіх вайсковых частках праводзяцца „вечары тэхнікі“.

БЫЦЬ ЗАЎЖДЫ ГАТОВЫМІ ДА АБАРОНЫ КРАІНЫ

КОЖНЫ ПОСЬПЕХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА СССР—УДАР ПА КАПІТАЛІЗМУ. СУСЬВЕТНЫ ІМПЭРЫЯЛІЗМ РЫХТУЕЦЦА ЎЗБРОЕНАЙ СІЛАЙ ПЕРАШКОДЗІЦЬ НАШАМУ БУДАЎНІЦТВУ

Узмацненьнем работы ТДА-Авіяхэму, замацаваньнем сувязі з Чырвонай арміяй і марфлётам, будзем рыхтаваць з комсамольцаў і працоўнай моладзі тысячы ўмелых байцоў за заваёвы Кастрычніка

Сёньня першы дзень „Дэкады абароны“ па БССР, абвешчанай Цэнтральным Саветам ТДА-Авіяхэму БССР. Савецкая Беларусь ляжыць на мяжы з капіталістычным Захадам і ў першую чаргу з белафашысцкай Польшчай, што надае гэтай кампаніі выключна важнае палітычнае значэньне і рашуча ставіць неабходнасьць паставіць задачу пасьпяховага правядзеньня „Дэкады“ ў цэнтр увагі партыйных, комсамольскіх, профсаюзных арганізацый і ўсёй працоўнай савецкай грамадзкасьці нашай краіны.

Увесь Савецкі Саюз, а ў тым ліку і наша Савецкая Беларусь, пад непахісным, выпрабаваным кіраўніцтвам Ленінскай Комуністычнай партыі, уступіў у пэрыяд шырока разгорнутага соцыялістычнага наступу па ўсім фронце. Крок за крокам, пабудаваныя на апошняму слову замежнай тэхнікі, новыя гіганты соцыялістычнай індустрыі, узмацняючы нашу краіну, бязьлітасна абвяргаюць панурыя прадказаньні правых опортуністых—маразмістаў.

Пабудова на Беларусі Сталінстану, Сельгасмашу, Магвалакнабуду і шэрагу іншых волатаў індустрыі—гэта вынік правільнай генэральнай лініі партыі, вынік рэалізацыі бальшавіцкага лёзунгу „дагнаць і перагнаць“.

Шырыцца хваля колектывізацыі. Перабудова сельскай гаспадаркі на соцыялістычны лад ахапляе ўсё новыя і новыя пласты батрацтва, беднаты і серадняцтва. З кожным днём крышацца старыя вякоўскія падпоркі капіталістычнай вёскі, руйнуюцца векавыя межы. Гігантным поступам ідзе на зьмену новае жыцьцё—сотні тысяч комун і колгасаў пакрываюць неабсяжныя абшары Савецкага Саюзу. Партыя і рабочая кляса прыступілі да рашучага ажыцьцяўленьня політыкі ліквідацыі кулацтва як клясы на аснове суцэльнай колектывізацыі.

Гэтыя вялізарныя посьпехі соцыялістычнага будаўніцтва нашай савецкай краіны выклікаюць абвастрэньне клясавай барацьбы, ашалелае супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў мерапрыемствам партыі і Савецкае ўлады.

Адчуваючы набліжэньне сваёй пагібелі, кулак, а разам з ім і ўся клясава-шкодная контррэволюцыйная зграя—нэпман, папоўшчына і інш., робяць спробы сарваць соцыялістычнае будаўніцтва перашкаджаючы ўсімі сіламі пасьпяховаму правядзеньню хлеба і бульбазагатовак, бальшавіцкага, севу імкнуцца шкодніцкімі актамі дэзорганізаваць прамысловасьць, справу рабочага забясьпечаньня і г. д.

Надзеі сусьветнай буржуазіі на капіталістычнае перараджэньне Савецкага Саюзу лопнулі як мыльны пузыр. Імпэрыялістыя разгарнулі шалёную падрыхтоўку ўзброенага нападу на СССР. Кожны новы наш посьпех—удар па капіталізму. Ліхаманкава разгортваецца ваенная прамысловасьць, куды буржуазія ўкладвае шалёныя грашовыя сродкі. Хэмія і авіяцыя—вось баявая аснова набліжаючыхся рашаючых боек.

Падрыхтоўваючы ўзброеную ваенную інтэрвэнцыю супроць СССР, буржуазія імкнецца ажыцьцявіць эканомічную блёкаду—разгортвае кампанію супроць савецкага экспорту, пускае провокацыйныя чуткі аб савецкім „дэмпінгу“ і ўрэшце шчодра рассыпае па асноўных галінах нашага будаўніцтва шкодніцкія, контррэволюцыйныя шпіёнскія організацыі.

Зусім нядаўна была выкрыта буйная шкодніцкая организацыя ў органах рабочага забясьпечаньня. Зараз выкрыт саюз інжынэрных організацый—так званая „Прамысловая Партыя“, якая працавала пад непасрэдным кіраўніцтвам француская генэральнага штабу.

Рэальная пагроза ваеннай небясьпекі, яе тэхнічныя асаблівасьці настойліва высоўваюць перад партыяй, комсамолам і ўсёй працоўнай савецкай грамадзкасьцю задачу ўсямернага ўзмацненьня абароназдольнасьці нашай краіны, забясьпечаньня вайскова-сьвядомай тылавой абароны, што ў сваю чаргу ставіць задачу шырокага прасоўваньня ў гушчы працоўных мас ваенна-тэхнічных ведаў.

Задача авалоданьня ваенна-тэхнічнымі ведамі высоўваецца з асаблівай вастрынёй перад комсамольскай організацыяй. У якім становішчы знаходзіцца зараз ваенная работа ў комсамоле? Трэба сказаць—у нездавальняючым.

Правядзеньне гэтай задачы ў комсамоле часта зводзіцца да кампаній.

Ваенкуткі ў большасьці не абсталяваны, абсталяваныя-ж працуюць зусім нездавальняюча.

Найбольш слабое месца ў вайсковай рабоце комсамолу гэта—работа па шэфству над РСЧА і флётам і практычны ўдзел організацыі ў працы ТДА-Авіяхэму. У гэтай галіне конкрэтная, жывая справа вельмі часта падмяняецца нікчэмнай славеснай шуміхай, мітынгоўшчынай, а ў горшым выпадку работа зусім не вядзецца.

Слаба падтрымліваецца сувязь грамадзянскай КСМ організацыі з вайсковай.

Яшчэ дагэтуль ня выканан лёзунг аб 100 проц. уступленьні КСМ у шэрагі ТДА-Авіяхэму.

Урэшце патрэбна сказаць, што наш друк, у прыватнасьці комсамольскі, зусім невыстарчальную ўвагу ўдзяляе пытаньням вайсковай работы.

З такім становішчам работы па ваенізацыі нельга мірыцца. Вось чаму „Дэкада абароны“, якая праводзіцца зараз ТДА-Авіяхэму, набывае выключнае значэньне і патрабуе настойлівай увагі партыйных, комсамольскіх організацый і ўсяе савецкае грамадзкасьці.

„Дэкада абароны“ павінна зьявіцца генэральнай праверкай стану вайсковай работы КСМ, павінна даць штуршок як да палепшаньня зьместу так і пераключэньня на рэйкі сыстэматычнай работы.

Бюро Цэнтральнага Камітэту ЛКСМБ у сваёй пастанове аб удзеле КСМ організацыі ў правядзеньні „Дэкады абароны“ высоўвае перад організацыяй шэраг практычных мерапрыемстваў па вайсковай рабоце КСМ, якія ў асноўным зводзяцца да наступнага:

Праз „Чырвоную Зьмену“ правесьці масавы агляд работы КСМ організацыі па шэфству над Чырвонай арміяй і флётам. Абавязаць РК і ячэйкі КСМ неадкладна распрацаваць шэраг практычных мерапрыемстваў, якія забясьпечылі-б карэннае палепшаньне шэфскай работы ў найкарацейшы тэрмін. Неабходна зараз-жа аднавіць перапіску з падшэфнымі часткамі РСЧА і флётам, асабліва з падшэфным комсамолу Беларусі лінкорам „Парыская Комуна“ і АБВШ.

Праводзімая «Дэкада абароны» павінна яшчэ больш палепшыць сумесную работу комсамолу з ТДА-Авіяхэмам у справе прасоўваньня ў шырэйшыя гушчы насельніцтва ваенна-тэхнічных ведаў. Неабходна перагледзець склад вылучаных прадстаўнікоў у РСТДА-Авіяхэму, зьмяніўшы неапраўдаўшых сябе работнікаў. Праверыць выкананьне дырэктывы аб 100 проц. уцягненьні комсамольцаў у шэрагі ТДА-Авіяхэму, і якасны ўдзел іх ва ўсёй практычнай рабоце ТДА-Авіяхэму. Больш папулярызаваць організацыю Чырвонага Крыжу, дабіўшыся масавага ўцягненьня ў яе шэрагі асабліва працоўных жанчын.

„Дэкада абароны“ павінна стаць адначасова і кампаніяй шырокай праверкі пастаноўкі ваенізацыі ў клюбах, хатах-чытальнях, школах. Прыцягваючы да правядзеньня гэтага мерапрыемства шырокія масы працоўных, неабходна дабіцца карэннага палепшаньня ў справе ўвядзеньня ваенізацыі ў сыстэму культурна-масавай выхаваўчай працы праз організацыю спэцыяльных ваенізаваных вечароў самадзейнасьці, належнае абсталяваньне вайсковых кутоў, скарыстаньне мобілізаваных чырвонаармейцаў, камандыраў запасу настаўніцтва і г. д.

Райкомы і ячэйкі ЛКСМБ павінны забясьпечыць актыўны ўдзел у „Дэкадзе абароны“ піонэр-організацыі і шырокія масы школьнікаў і неорганізаванай дзетвары.

Цьвёрда памятаючы, што асновай абароназдольнасьці краіны Саветаў застаецца шпаркі рост эканомічнай магутнасьці Саюзу, „Дэкада абароны“ павінна прайсьці пад знакам палепшаньня ўдзелу КСМ, рабочай і працоўнай моладзі ў соцыялістычным будаўніцтве. Яшчэ больш бязьлітасна змагаючыся за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі супроць права-опортуністычных здраднікаў, комсамол павінен дабіцца лепшых посьпехаў у разгортваньні ўдарных тэмпаў будаўніцтва нашай соцыялістычнай вытворчасьці, у выкананьні прамфінпляну і паказаць сапраўды бальшавіцкія прыклады барацьбы за соцыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі.

Новыя сотні ўдарных брыгад, дзесяткі тысяч ударнікаў вытворчасьці і колгасных палёў—вось наш адказ капіталістычным провокатарам у „Дэкаду абароны“ краіны.

Вялізарную ролю ў будучым змаганьні адыграе ўзровень клясавай політычнай сьвядомасьці рабочае клясы і шырокіх працоўных мас. Таму ўсе мерапрыемствы „Дэкады абароны“ і наогул вайсковая праца павінна быць прасякнута глыбокім клясава-вытрыманым ідэолёгічным зьместам.

XVI і XIII зьезд УсеКП(б) і КП(б)Б адвялі вялікую ўвагу пытаньню ўзмацненьня абароназдольнасьці СССР. Вышэйпрыведзеныя мерапрыемствы зьяўляюцца групай пытаньняў, зьвязаных з практычнай рэалізацыяй усёй складанай сыстэмы рашэньняў XVI і XIII-га зьездаў партыі ў гэтай галіне.

Неабходна штодзённа памятаць, што „неўгамонны ня дрэмле вораг, што час мірнай перадышкі ўпарта скарачаецца“.

На варце савецкіх межаў



Атрад чырвонаармейцаў-пагранічнікаў аб'яжджае межы Паміра

15-га СЬНЕЖНЯ—X ЗЬЕЗД ЛКСМБ

Усім організацыям ЛКСМБ

У сувязі з перанясеньнем IX-га ўсесаюзнага зьезду комсамолу, скліканьне X-га зьезду ЛКСМБ з 15-га лістапада пераносіцца на 15-ае сьнежня. Абвестка дня наступная:

1. Агульна-політычны даклад ЦК КП(б)Б;
2. Даклад ЦК УсеЛКСМ;
3. Даклад КІМ'у;
4. Справаздача ЦК ЛКСМБ;
5. Справаздача цэнтральнай рэвкамісіі;
6. Колгаснае будаўніцтва і задачы ЛКСМБ на вёсцы;
7. Вынікі і далейшыя задачы ўдзелу ЛКСМБ у нацкультурным будаўніцтве;
8. Аб рабоце сярод дзяцей;
9. Выбары: а) ЦК ЛКСМБ, б) Цэнтральнай рэвкамісіі ЦК ЛКСМБ, в) выбары дэлегатаў на IX зьезд УсеЛКСМ.

Дэлегаты на X зьезд ЛКСМБ абіраюцца на райконфэрэнцыях па модусу: ад 400 членаў КСМ — адзін дэлегат з правам рашаючага голасу. Калі лік членаў перавышае модус ня меншы як на 150 чалавек—таксама абіраецца адзін дэлегат.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ Палякоў.

Чырвоная армія выхоўвае кадры актыўных барацьбітоў за соцыялістычную перабудову вёскі



Чырвонаармейцы-адпускнікі вывучаюць трактар

ПРАВЕРЫМ ВЫКАНАНЬНЕ САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ

У „ДЭКАДУ АБАРОНЫ“ ОРГАНІЗУЕМ АГЛЯД ШЭФСТВА ЛКСМБ НАД ФЛЁТАМ

Разгортвайце соцспаборніцтва на лепшы ўдзел у аглядзе, мацуйце снасьці шэфскай работы



НА ВАХТЕ

Будзённая работа чырвонафлётцаў наскрозь прасякнута адной галоўнай мэтай—даць магчымасьць савецкай краіне мірна будаваць социялізм.

Комсамол шэфствуе над флётам. Ён узяў на сябе абавязак практычна дапамагаць у выкананьні ганаровага абавязку, ускладзенага на Чырвоны флёт.

ЛКСМБ ужо 7 год шэфствуе над лінкорам „Парыская Комуна“.

Падагульняючы некаторыя вынікі шэфства ў дэкаду абароны, трэба падкрэсьліць, што ў гэтай галіне наша работа кульгае.

Зараз у сувязі з ліквідацыяй акруг, работа па шэфству над флётам шмат дзе заняпала. Райкомы часта ня ведаюць, над якімі кубрыкамі яны шэфствуюць.

Шэфства патрабуе карэннага паляпшэньня.

Трэба перагледзець прымацаваньне райкомаў і ячэек да асобных адзінак лінкору, з якімі комсамольскія організацыі павінны будуць падтрымліваць цесную сувязь. Трэба ўсю работу па сувязі і шэфству над флётам пераве ьці на рэйкі соцспаборніцтва. Узаемнае абавязацельства па пытаньнях выкананьня пяцігодкі ў 4 гады з усімі выцякаючымі адсюль абавязкамі комсамольскай організацыі Беларусі і комсамольцаў-чырвонафлётцаў—ахова межаў СССР, усямернае разьвіцьцё Чырвонага флёту—павінны легчы ў аснову сувязі ЛКСМБ з чырвонафлёцкай комсамоліяй.

Скарыстаць дэкаду абароны для ажыўленьня работы па шэфству, завязаць сапраўдную цесную сувязь, аказаць практычную дапамогу ў рабоце флёту,—асноўная задача і абавязак комсамольскіх ячэек.

З гэтай мэтай „Чырвоная Зьмена“, на час дэкады абароны, організуе агляд стану шэфства Беларускай організацыі КСМ над лінкорам „Парыская Комуна“.

З фото-апаратам па караблю



У доку

Перавесьці шэфства на новыя рэйкі

Ужо 7 год комсамол БССР шэфствуе над лінкорам „Парыская Комуна“. Аднак, станоўчыя вынікі шэфскай работы ня надта значныя.

Чым-жа гэта тлумачыцца?

Калі глыбей углядзецца ў систэму шэфскай работы, дык можна заўважыць, як з боку беларускага комсамолу, так і з боку лінкора „Парыская Комуна“, шмат недарэчнасьцяй.

Асноўны недахоп работы лінкора па шэфству—гэта дрэннае кіраўніцтва ротных КГСП сэктарамі сувязі, вось чаму шэфства на караблі не кранулася з мёртвага пункту.

Раённыя камітэты ЛКСМБ, з свайго боку, бязуважліва абмінаюць пытаньні шэфства над лінкорам.

Такое становішча ў шэфстве беларускага комсамолу над лінкорам „Парыская Комуна“ далей нецярпіма.

Міжнародныя і ўнутраныя абставіны патрабуюць ад комсамолу БССР неадкладнай перабудовы шэфскай работы.

Неаходна, каб райкомы ЛКСМБ шчыльна падышлі да пытаньня шэфства, бо ад гэтага ў значнай меры залежыць абароназдольнасьць краіны.

Патрэбна работу па шэфству перавесьці на рэйкі соцспаборніцтва. Шляхам заключэньня дагавораў паміж паасобнымі комсамольскімі ячэйкамі, паміж грамадзянскімі і флёцкімі ячэйкамі павінна палепшыцца шэфства.

Неабходна ўсёй сыстэме работы надаць масавы характар, а не перыодычны ўздым, як гэта рабілася дагэтуль у шэфстве комсамолу Беларусі.

Дружная спайка комсамолу Беларусі з чырвонафлётцамі лінкора „Парыская Комуна“ павінна быць наладжана ўсур'ёз і надоўга.

Байцоў.

Нясем „баявы рапарт IX зьезду УсеЛКСМ“

Комсамольская організацыя лінкора „Парыская Комуна“ першаю з морскіх сіл Чорнага мора ўключылася ў комсамольскую эстафэту флёту—„баявы рапарт IX зьезду УсеЛКСМ“.

У дзень 16 МЮД'у быў дадзен старт комсамольскай эстафэце.

Зараз ужо можна падвесьці папярэднія вынікі. Так, калі ў першай дэкадзе ўдарніцтвам было ахоплена 40,8 проц. комсамольцаў, дык у 4 дэкадзе ўжо 80 проц. комсамольцаў.

Індывідуальным соцспаборніцтвам у першай дэкадзе было ахоплена 24,4 проц. комсамольцаў, а ў 4-й —51,6 проц. комсамольцаў.

Партыйнай асьветай у першай дэкадзе было ахоплена 89,1 проц., у чацьвертай дэкадзе—92,5 проц.

Такім чынам комсамольская організацыя „Парыскай Комуны“ сапраўды навярнулася тварам да выкананьня сваіх задач.

Социялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва займаюць галоўнае месца у рабоце комсамольскай організацыі лінкора. Вось чаму летнюю кампанію лінкор скончыў дасканала, атрымаўшы шэраг флоцкіх прызаў па хэміі, па сыгналізацыі, дальнамераў і, акрамя гэтага,—шэраг карабельных прызаў. Гэтыя ўзнагароды добра характарызуюць работу асабовага складу ў цэлым і комсамолу ў прыватнасьці.

Многія комсамольцы маюць [...] лін я заслугі. Так, **Зайкаў**-на[...]чык, командор, комсамолец—ле[...] наводчык паземнай наводкі. **Ваяводзін**—комсамолец--мае аг[...]ны флёцкі прыз за наводку [...] спаборніцтве. Тав. **Аксіменчы[к]** качагар—даў дзьве каштоўныя [...]пановы па ўдасканаленьню [ме]нізмаў.

За гэты пэрыод мы маем зна[чны] рост шэрагаў партыі і комсам[олу]. Зараз комсамол працуе над [...]раньнем да зімовага рамонту ка[...]ля ўдарных брыгад імя „3-га [...] пяцігодкі“.

Ня гледзячы на шэраг бу[...] дасягненьняў у рабоце комса[молу] „Парыскай Комуны“ мы да г[этага] часу маем пэраўнаўча высокі [...]цант дысцыплінарных прав[апарушэньняў] комсамольцаў. Комсамольская [ор]нізацыя мобілізавала ўсе свае [сілы] на барацьбу за якасныя паказ[чыкі] дысцыпліны. Наш лёзунг: Ноль [...]вінкаў з боку комсамольцаў.

Слаба праводзіцца збор пра[...] па рацыяналізацыі.

Ідэолёгічна комсамольская ор[гані]зацыя ў цэлым здаровая.

Гэта выяўляецца гарантыя[й] тым, што з задачамі зімовага [ра]монту комсамол лінкора спра[віцца].

К. Вілко[ў]

Як комсамолія Магілеўшчыны рыхтуец[ца] да дэкады абароны

3-га лістапада Магілеўскі РК КСМ на сваім пасяджэньні разгл[я]дзеў пытаньне аб удзеле КСМ у правядзеньні дэкады абароны.

У сваёй пастанове бюро РК зварочвае асаблівую ўвагу ком[са]мольскіх ячэек на правядзеньне шырокай растлумачальнай работы [ся]род рабочых колгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў аб падрыхтоўцы [ка]піталістычных краін да нападу на СССР і, у сувязі з гэтым, аб [за]дачах умацаваньня абароназдольнасьці Савецкага Саюзу. Бюро адзначыла, што практычная дзейнасьць комсамольскіх ячэек паві[нна] быць накіравана на організацыю ячэек ТДА-Авіяхэму і вайско[вых] гурткоў пры кожным прадпрыемстве, колгасе і вёсцы, на ўзмацне[ньне] работы існуючых ячэек ТДА-Авіяхэму і вайсковых гурткоў, на [вер]боўку новых членаў, на популярызацыю сярод комсамольцаў і пра[цоў]най моладзі пастаноў саюзу аб задачах вайсковай работы КСМ і не[ад]кладнае выкананьне пастановы аб 100 проц. уступленьні комсам[оль]цаў у ячэйкі ТДА-Авіяхэму і вайсковыя гурткі.

Для практычнай дапамогі ў працы, райком накіраваў вясковыя ячэйкі брыгады з гарадзкіх комсамольцаў.

Дзесяцігодзьдзе савецкага Перакопу

Па сьлядох ударнікаў Фрунзэ

(Адрыўкі з нарысу „В гостях у бессмертных“)

Кахоўка

Бярыслаўль застаецца ў баку. Над крутым берагам высіцца гарадзкая панорама. Спуск к парому ідзе паміж абчосаных каменьняў. На каменным плоце, калі глядзець з ракі, яшчэ відаць сьляды паветраных бомбандыровак.

Паром прыходзіцца доўга чакаць. Спадарожнік-стары успамінае аб боях, якія ішлі тут дзесяць год назад:

— Сем мастоў узьвялі тады белыя...

Гэта было, калі прыскакалі будзёнаўцы, Вось, бачыце, два выступы: там былі два масты, іншыя будаваліся бліжэй да Кахоўкі.

Цяпер Кахоўка—забыты гарадок. Пры ўезьдзе ў горад налічваем тры арцелі вінадзельных колгасаў. У горадзе тыповая провінцыйная ціша, але, па словах старшыні райвыканкому, у Кахоўкі ёсьць будучыня: будуецца збожжазагародная прыстань.

У Кахоўцы яшчэ не забыліся прыезду Міх. Ів. Калініна да будзёнаўцаў.

—Баявы стары,—гаворыць памнач. міліцыі гораду.—Белы аэроплян бомбы так і сыпле, а ён, не зьвяртаючы ўвагі на небясьпеку, прамову сваю працягвае. Былі тут яшчэ, у блюхераўцаў, Каменеў і Дзям'ян Бедны...

Гібель кавбрыга

... У Наталіне (гэта было дзесяць год назад) моцна засел адступаўшыя белыя часьці. Відаць было, што яны намерваюцца даць бой. Фронт групы Блюхера вельмі расьцягнуўся— трэ было сьпешна ачысьціць Наталіна, каб левы фланг групы не апынуўся пад агнём праціўніка. Улюбенцам камапдгрупы, слаўным, адважным і зухаватым камандзірам 51 кавгрупы быў т. Юшкевіч. Калі бой за Наталіна дайшоў вышэйшага пункту,—ударыла кавгрупа Юшкевіча. Праціўнік дрыгануў... Афіцэрскія батальёны ўцякалі, намазаўшы пяткі... Тав. Юшкевіч, разам з камісарам, захопленыя пагоняй за ворагам, рынуліся ўперад, задумаўшы абяззброіць групу афіцэраў, якія зьбіліся ў скіртаў. Т. Юшкевіч падскакаў да іх і прапанаваў здацца. Опіцэры, сабраўшыся падпарадкавацца яго патрабаваньню, заўважылі, што коньнікаў усяго двое. Перавага была на іх баку. Офіцэры далі залп. Юшкевіч паў мёртвым. Яго белы конь праёсься з парожнім сядлом насустрач падляцеўшым коньнікам. Камісара ранілі ў некалькіх мясцох.

... У шырокім стэпе, воддаль, мітусяцца званіцы... Вось і Наталіна. Справа ад дарогі стаяць дзьве вялікія скірты.

— Вось, таварышы, скірты, пад якімі загінуў Юшкевіч,—гаворыць наш праважаты.

На ўскудлачаным полі паводаль стаяць два трактары. Пад'яжджаем да гумнаў. З-за стагоў паказваецца пастушок.

— Эй, хлопчык, чые скірты?

— Комуна Сталіна нумар восем...

Мне гэты просты адказ здаецца глыбоказначным.

— Таварыш Юшкевіч, ты ня дарма аддаў сваю маладую кроў...

Мы едзем ад Джанкоя на Чангарскую паўвыспу. Не даяжджаючы Тага аша, на дарозе памятная дошка:

— Тут ляжаць 53 байцы 30-й стралковай дывізіі, загінуўшыя за справу рэволюцыі".

Яны загінулі ў баю, калі коньніца Барбовіча ў апошні раз паспрабавала адчайнай атакай спыніць чырвоных перад Джанкоем.

Не даяжджючы да валу, мы ўбачылі другую лінію акопаў, ужо размытую дажджамі, і тут-жа лягер цяжкай артылерыі. Гармат няма. Апошнюю гармату, якая ляжала тут на працягу 10 год, гэтымі днямі купілі мясцовыя утыльсыравіньнікі Рудмэтальгандлю. Драцяных загарад няма, але лініі іх у Сівашы віднеюцца ясна.

Пераяжджаем мост. Тут стаялі чырвоныя. Яшчэ відны бліндажы. Маста тады, бязумоўна, ня было. Тырчэлі адны толькі абвугленыя палі.

Пераход праз Сіваш

Перадаю ўспаміны б. камандзіра 30 стралковай дывізіі т. Грязнова:

— Мы былі левафланговай групай наступаючага фронту. Лявей ад нас біліся часьці 1-й коннай (Генічэск Арабацкая страла), справа наступала 52-я стралковая. 30 я дывізія ішла ў дзьвюх калёнах. Правая калёна—на дамбу, левая—на сіваскі мост... Белыя не пасьпелі зьнішчыць будаўнічы матар'ял, які меўся на паўночным баку, і мы пачалі кідаць дошкі на палі, якія тырчэлі проста на паверхні вады.

Узводы, роты і батальёны ператварыліся ў сапёраў: у адной руцэ вінтоўка, у другой - дошка, бервяно, сякера альбо піла.

Праціўнік трымаў гэтую вузкую паласу пад зьнішчальным артылерыйскім і кулямётным агнём.

„Зьнішчальны агонь“. Гэты тэрмін здаецца крыху напышлівым, але глыбокія варонкі, як знакі ад воспы, пакрывалі ўсю паласу, што ляжала ўправа і ўлева ад маста, былі лепшай ілюстрацыяй да гэтых слоў.

Вада, гразь і зямля ўздыбіліся ў крывавыя фантаны. Адна граната вырвала цэлы ўзвод. Людзі ішлі па тонкіх дрыжачых дошках сьпехам зьбітага маста. Перашлі першыя роты, батальёны; замоўклі першыя кулямёты, замоўкла адна батарэя. Мост умацавалі, дошкі сталі ўстойлівымі, і кавалерыя кранулася... Гуськом, паадзіночцы, ехалі коньнікі. Хто аглядаўся па баках, альбо глядзеў назад, той валіўся ў ваду... На яго месца ўступалі іншыя... Пасьля вады, пасьля жахаў пераходу праз мост дрот і агонь здаваліся чырвонаармейцам драбніцай... Кавалерыя рынулася на Джанкойскую паўвыспу.

Па дамбе ўзад і ўперад хадзілі броняваныя страшыдлы і пляваліся агнём і стальлю.

Тры дні ішло нэрвовае змаганьне сталёвых машын і вогненых людзей.

Уноч на чацьверты дзень перакінулі бронецягнік... 30-я дывізія закрочыла па Крыме...

Уперад, у імя рэволюцыі!

Калі часьці 15-й дывізіі і агнявой брыгады перайшлі Сіваш, калі вада хлынула назад, напружаньне штабу камандваньня дасягла кульмінацыйнага пункту.

— Як быць?.. Адклікаць часьці назад?

— Не, уперад у імя рэволю[цыі]—быў за ад Фрунзэ.

... Пайшлі ўперад...

І тут былі такія, якія сумн[ява]ня верылі ў сілы чырвоных [...]

Ад гэтых панікёраў перадавы[я] цугі даведаліся, што вада сх[лынула] назад. І гэта ледзь не паслужыла [пры]чынай вялікіх бед. Але тут [...]сказалася роля палітбайца, які [...]дзіў „кампанію перамогі“. Кар[...] выйграў політбаец.

Становішча было ў момант [...]мулявана.

— За ду вада, уперадзе аг[онь]. Жыцьцё толькі ў руху наперад [...]рамозе...

І ішлі...

Назіральнікі ля валу, прыс[...]ваючыся да руху агня на паўн[...] заўважылі на вале нейкае хва[лява]не. Камандваньне загадала пашу[...] праціўніка. Часьці, спатканыя [...] агнём, падняліся ўздоўж валу і [...]ліся ў атаку. Белыя ня сталі [...] лабовага ўдару, адчуўшы не[...] тыле справа.

Часьці дывізій рынуліся за ў[...]гаючым праціўнікам, не даючы [...]ніцца ля Армянску. На гэты р[...]гоня была праведзена дас[...] Часьці нашы ішлі па пятах [...] Юшунскія позыцыі, хаця і з [...] ахвярамі, былі ўзяты „на—ко[...]

Узяцьцем Юшуна дарога на [...]кой і Сымфэропаль адчынілася [...]кімі варотамі, куды ўлілася чыр[...] кавалерыя, падтаптаўшы па[...] часьці адступаючых армій. Тут [...]ройск трымалі сябе кулямётчы[...] ліхвацкім набегам паставілі 100 [...]нак ва ўпор кавалеры Барбові[ча].

* * *

Ударнікі перавароту, байцы Ф[...] пераступілі прамфінплян пера[...] год назад.

Мата З[...]

КОМСАМОЛ НЕПАХІСНЫ

У БАРАЦЬБЕ ЗА ЛЕНІНСКУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ

СУПРОЦЬ ПРАВАОПОРТУНІСТЫЧНЫХ І АВАНГАРДЫСЦКІХ—„ЛЕВА“ ТРАЦКІСЦКІХ НАСКОКАЎ НА ЛІНІЮ ПАРТЫІ

Сакрушальны адпор права-„левацкім“ фракцыянэрам—двурушнікам

Выпраўляючы памылку, па-бальшавіцку змагацца за генэральную лінію партыі

Комсамольская організацыя, зьяўляючыся верным памоцнікам партыі, працуючы пад яе непасрэдным кіраўніцтвам, сваёй асноўнай задачай ставіць упартае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі нашай партыі. Гісторыя ЎсеЛКСМ зьяўляецца неадлучнай часткай гісторыі партыі: упартая барацьба пад кіраўніцтвам партыі за замацаваньне заваёў Кастрычніка, за ажыцьцяўленьне задач соцыялістычнага будаўніцтва, за наступленьне на капіталістычныя элемэнты і ажыцьцяўленьне політыкі ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі.

Усім зразумела, што асноўнай задачай выхаваньня мас комсамольцаў у духу бальшавізму, правільнага клясавага выхаваньня мас працоўнай моладзі, організацыі яе ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве, зьяўляецца поўнае ўсваеньне традыцый бальшавізму непрымірымасьць у барацьбе за чыстату ленінскай лініі комуністычнае партыі.

На ўсіх этапах барацьбы нашай партыі—авангарду рабочае клясы і адзінаму кіраўніку соц. будаўніцтва—комсамол давёў сваю адданасьць справе Леніна. **„Ленінскі комсамол і кіруемая ім рабочая моладзь увенчваюць справу спаборніцтва і ўдарніцтва рашаючымі посьпехамі. Трэба прызнаць, што наша рэволюцыйная моладзь адыграла ў гэтай справе выключную ролю“** (Сталін. Політсправаздача ЦК УсеКП(б) 16-ым зьезьдзе).

Комсамол аказаў не малую дапамогу партыі ў справе соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.

Апраўдаць званьне Ленінскага комсамолу, забясьпечыць актыўны ўдзел комсамольскіх мас у соцбудаўніцтве саюз мог толькі таму, што ён заўсёды высока трымае сьцяг Леніна. Пад кіраўніцтвам партыі комсамол давёў сваю адданасьць справе соцыялізму, прымаючы самы актыўны ўдзел у барацьбе з контррэволюцыйным троцкізмам.

Правая небясьпека, якая адбівае кулацкія інтарэсы зьяўляецца зараз галоўнай небясьпекай. Комсамол, змагаючыся за **бальшавіцкія тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва**, дае рашучы адпор праваапортуністычным капітулянцкім вылазкам як у тэорыі, так і на практыцы.

Той факт, што выкрыты права-„лявацкі“ блёк опортуністых фракцыянэраў стаяў на праваопортуністычнай плятформе лішні раз падцьвярджае правільнасьць партыйнай устаноўкі аб тым, што правая небясьпека зьяўляецца галоўнай і выкрывае ўяўную лявізну „лявацкіх“ вылазак паўтроцкісцкіх элемэнтаў. Концэнтруючы галоўны агонь па правых двурушніках і іх саюзьніках „левых“ фразёрах, рашуча б'ючы па прымірэнцтву, мы ні на хвіліну не павінны забываць аб магчымасьці вылазак троцкістых, якія прыкрываючыся левай фразай, імкнуцца дзе-ні-дзе працягнуць свае „тэорыі“.

„Гэтую барацьбу асабліва неабходна весьці ў комсамоле таму, што ў комсамоле людзі маладыя, не прайшлі яшчэ школы рэволюцыйнай барацьбы і лягчэй паддаюцца на левыя фразы“ (Кагановіч. Прамова на І-ай Маскоўскай абласной конфэрэнцыі ЛКСМ).

Партыя і комсамол далі ў свой час рашучы адпор паўтроцкісцкім „левым“ загібам Шацкіна і Стэна, якія імкнуліся працягнуць троцкісцкія ідэйкі, супроцьстаўленьня комсамолу партыі заяўляючы, што «кожны комсамолец на сваім вопыце павінен сур'ёзна прапрацоўваць усе пытаньні і такім чынам упэўнівацца ў правільнасьці генэральнай лініі нашай партыі“.

Комсамол, лаўшы рашучы адпор авангардысцкай тэорыі Троцкага, з такой-жа няпрымірымасьцю ўдарыў па „лявацкіх“ загібах Шацкіна і Стэна.

Шкоднасьць авангардысцкай „тэорыі“, якая імкнецца адарваць КСМ ад партыі, ад соцыялістычнага будаўніцтва такім чынам відавочна. Таму ў мэтах барацьбы за адзінства нашых шэрагаў, за генэральную лінію партыі мы павінны даваць рашучы бой і „левым“ авангардысцкім тэорыям у якой-бы форме яны ні праяўляліся.

У сувязі з гэтым трэба падкрэсьліць, што „Чырвоная Зьмена“, праводзячы ў асноўным правільную політычную лінію, дапусьціла „левую“, авангардысцкага тыпу, памылку, даўшы загаловак: комсамол перадавы атрад змагаючагася пролетарыяту“.

Прызнаўшы бясспрэчную шкоднасьць вышэй паказанага загалоўку, „Ч. З.“ паглыбіла гэтую памылку, ня даўшы своечассва на старонках газэты глыбокага аналізу політычнай шкоднасьці авангардызму, што зусім правільна падкрэсьліла „Зьвязда“.

„Чырвоная Зьмена“ правёўшы ў свой час пад кіраўніцтвам партыі і ЦК ЛКСМБ вялікую барацьбу з троцкізмам, з „левымі“ загібамі тыпу Шацкіна, Стэна, па-бальшавіцку выправіўшы зараз дапушчаную політычную памылку, з яшчэ большай непрымірымасьцю будзе змагацца за генэральную лінію партыі, мобілізуючы масы комсамолу і працоўнай моладзі на барацьбу з правым ухілам, двурушніцтвам, як галоўнай небясьпекай, з „левымі“ загібамі — саюзьнікамі правых і прымірэнцтвам да іх.

„Кожны комсамолец павінен уразумець, што мы змагаемся на два франты, што мы разьбілі троцкізм не для таго, каб на плечы партыі, якая змагаецца з правым ухілам, зноў узваліўся паўтроцкізм—маленькі троцкісьцік. Мы змагаліся з троцкісцкай ідэолёгіяй, якая супроцьстаўляла моладзь партыі, якая супроцьстаўляла маладое пакаленьне старому“ (з прамовы Кагановіча на 1-ай Маскоўскай Абл. Конфэрэнцыі УсеЛКСМ).

Мы павінны і надалей рашуча біць па рэцыдывах гэтага парадку, накіроўваючы галоўны агонь направа.

Пастанова

Сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ ад 12 лістапада 1930 г. аб дапушчанай політычнай памылцы з боку „Чырвонай Зьмены“

1. Сэкратарыят ЦК адзначае, што пры правільнай політычнай лініі, якую праводзіць „Чырвоная Зьмена“, у нумары ад 7-XI г. г. яна дапусьціла грубую політычную памылку, даўшы „пад шапку“— „Комсамол—перадавы атрад змагаючагася пролетарыяту“, што па сутнасьці зьяўляецца „левым“ загібам авангардысцкага парадку. Замест таго, каб яшчэ раз падкрэсьліць, што перадавым атрадам пролетарыяту зяўляецца партыя, пад кіраўніцтвам якое выхоўваецца і працуе ЛКСМБ, „Чырвоная Зьмена,“ прызнаўшы памылку і даўшы папраўку ад 10-XI г. г., глыбока не раскрытыкавала дапушчаную ёю політычную памылку.

2. Адзначыць, што ЦО партыі „Зьвязда“ зусім правільна падняла пытаньне, падпарадкаваўшы крытыцы дапушчаную памылку „Чырвонай Зьмены“.

3. Прапанаваць „Чырвонай Зьмене“ на старонках газэты шырока асьвятліць гэта пытаньне, даўшы адпаведную крытыку дапушчанай памылкі.

4. Гэтую пастанову апублікаваць у друку.

Даць ясны і дакладны адказ

Двурушнікам—ня месца ў комсамоле

Заслухаўшы інформацыю аб дзейнасьці і выступленьнях правых опортуністых двурушнікаў—агульны аб'яднаны сход груп палка і сутаварыскай ячэйкі Хэмфармзаводу рэзка асуджае гэтыя выступленьні, лічачы іх паклёпам на комсамол.

Заява Бутыркіна і члена ЦК ЛКСМБ Целешава аб безактыўнасьці комсамолу і аб крызісе ў саюзе, адмаўленьне Мінаева ад работы—гэта трусасьць і дэзэртырства з фронту соцыялістычнага будаўніцтва. Адначасова сход лічыць нясумяшчальным прабываньне ў КСМ праваопортуністых і двурушнікаў тыпу Мінаева, Бутыркіна і Целешава.

Сход са здавальненьнем вітае рашэньні аб выключэньні з партыі праваопортуністычных элемэнтаў—Сьляпкова, Руціна, Нусінава і Каврайскага, якія зьяўляюцца агэнтурай клясавага ворага ўнутры УсеКП(б).

Сход рашуча патрабуе неадкладна даць зусім ясны і дакладны адказ аб сваіх адносінах да генэральнае лініі партыі, а таксама і рашучай бальшавіцкай барацьбы з правым ухілам з боку былых яго лідэраў Бухарына, Рыкава і Томскага.

Сход вітае рашэньне бюро ЦК КСМ Беларусі які па-бальшавіцку выправіў свае памылкі, разгарнуўшы энэргічную работу па барацьбе з конкрэтнымі праявамі опортунізму ў комсамоле.

У адказ на вылазкі Бутыркіна, Мінаева і Целешава комсамольская організацыя яшчэ цясьней згуртуецца вакол партыі і ленінскага ЦК комсамолу для ажыцьцяўленьня пастаўленых соцыялістычным будаўніцтвам задач, яшчэ больш узмоцніць работу па падрыхтоўцы баявога рапарту IX-му зьезду комсамолу.

Прэзыдыум сходу.

Аб права-опортуністычным выступленьні Целешава

З рэзолюцыі агульна-гарадзкога комсамольскага сходу супольча з колектывам с-г акадэміі ад 9-XI 1930 г. па дакладу аб рашэньні ЦК ЛКСМБ

У час падрыхтоўкі да зьездаў комсамолу правыя опортуністыя атакуюць лінію партыі ў пытаньнях разьвіцьця саюзу, як Бутыркін, Мінаеў, якія прарочаць аб крызісе саюзу, што з ашло адбіцьцё ў выступленьні Целешава на апошнім пленуме ЦК ЛКСМБ і па сутнасьці зьяўляецца права-опортуністычнай пераклічкай з Бутыркаўшчынай і Мінаеўшчынай. Рашуча асуджаючы права-опортуністычныя выступленьні Целешава, сход адмяняе сваю ранейшую пастанову, якая няправільна кваліфікавала выступленьне Целешава, як „левы“ наскок на лінію партыі.

Сход вітае пастанову ЦК ЛКСМБ ад 29-X 1930 г., у якой правільна кваліфікуецца выступленьне Целешава, як права-опортуністычнае, і прызнае дапушчаную політычную памылку бюро ЦК ЛКСМБ, што права-опортуністычнае выступленьне Целешава своечасова не скарыстана ў справе яшчэ большай мобілізацыі мас комсамолу на барацьбу супроць правага опортунізму. Сход ухваляе рашэньне ЦК ЛКСМБ аб зьняцьці Целешава з працы сэкратара Горацкага райкому комсамолу за права-опортуністычнае выступленьне і двурушніцтва і ставіць пытаньне перад ЦК ЛКСМБ аб выводзе Целешава з складу ЦК.

Лічыць неабходным справу аб права-опортуністычным выступленьні Целешава прапрацаваць на ўсіх ячэйках ЛКСМБ, скарыстаўшы яе для яшчэ большай мобілізацыі комсамольскіх мас на барацьбу з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай, і „левымі“ загібамі—саюзьнікамі правых. Сход заклікае ўсю Горацкую райорганізацыю яшчэ больш зьяднацца вакол комуністычнае партыі і яе генэральнай лініі.

Сход асуджае выступленьне Сьцяпанава, які змазвае політычную сутнасьць права-опортуністычнага выступленьня Целешава, кажучы: „глупа зрабіў Целешаў, што ён гэтак выказаўся“,—гэта ёсьць ні што іншае, як солідарызацыя з Целешаўшчынай. Сход патрабуе неадкладнага разбору ячэйкай справы аб Сьцяпанаве.

ЗА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ НАЦПОЛІТЫКІ ПАРТЫІ

Рашэньні 16 зьезду УсеКП(б), 13 зьезду КП(б)Б і, на іх падставе, рашэньні Кастрычнікаўскага пленуму ЦК КП(б)Б па нацыянальнаму пытаньню набываюць выключна важнае політычнае значэньне. Комсамольская організацыя павінна неадкладна ўзяцца за прапрацоўку гэтых рашэньняў, за практычнае іх ажыцьцяўленьне.

Тав. Гей у сваім дакладзе на менскім партактыве адзначыў: „Мы ідзем бальшавіцкім шляхам у вырашэньні нацыянальнага пытаньня. Тэмпы гаспадарчага разьвіцьця, часткова тэмпы разьвіцьця прамысловасьці ў нас, у БССР, значна вышэй агульна-саюзных тэмпаў. Мы даганяем Савецкі Саюз, мы падцягваемся да матар'яльнага гаспадарчага і культурнага ўзроўню, на якім стаіць Савецкі Саюз“. Гэтая ўстаноўка з усёй яскравасьцю падкрэсьлівае, што толькі пролетарыят, які стаіць на чале ўлады, пад кіраўніцтвам яго авангарду—комуністычнае партыі, можа вырашыць пытаньне нацыянальнай політыкі і галоўны лёзунг нацпытаньня—„права нацый на самавызначэньне, аж да адлучэньня“. Гэты лёзунг, у сваю чаргу, не выключае, а наадварот,—прадпалагае права нацыі на добраахвотнае аб'яднаньне. Пленум яшчэ раз падкрэсьліў, што лёзунг партыі—„права нацыі на самавызначэньне, аж да адлучэньня“, які не выключае, а наадварот — прадпалагае права нацыі на добраахвотнае аб'яднаньне, прадпалагае адначасова і зьнішчэньне фактычнай няроўнасьці раней прыгнечаных нацыянальнасьцяй, клопаты аб іхным культурным і матар'яльным уздыме“.

На прыкладзе Савецкай Беларусі, як і іншых рэспублік Савецкага Саюзу, мы з усёй відочнасьцю бачым, што толькі наша партыя змагла правільна вырашыць нацыянальнае пытаньне. На прыкладзе Савецкай Беларусі мы бачым, як выконваюцца галоўнейшыя лёзунгі партыі. Мы бачым, як з краіны непраходных балот, адвечнай цемры, бяскультур'я, з жабрацкай краіны, якая знаходзілася пад царскім ботам, цяпер пад кіраўніцтвам нашай партыі расьце і разьвіваецца Савецкая Беларусь, даганяючы ў эканомічных і культурных адносінах перадавыя рэспублікі Савецкага Саюзу.

Дзякуючы бальшавіцкаму вырашэньню нацыянальнага пытаньня, мы бачым агромністы рост соцыялістычных элемэнтаў. Растуць волаты соцыялістычнай прамысловасьці, растуць колгасы, саўгасы, расьце і ўзмацняецца будаўніцтва нацыянальнай па форме і пролетарскай па зьместу культуры. Асноўныя паказальнікі становішча нашай соцыялістычнай гаспадаркі сьведчаць з усёй паўнатой аб тым, што мы маем цьвёрдае і хуткае прасоўваньне наперад.

Валавая продукцыя прамысловасьці за апошні год вырасла на 68 проц., тады як пяцігадовым плянам намячаўся рост на 38 проц. У капітальнае будаўніцтва летась мы ўлажылі 44 міліёны рублёў, а пяцігодкаю было вызначана 38,5 міліёнаў рублёў. Рабочая сіла за адзін толькі мінулы год вырасла на 14 тысяч чалавек, альбо на 32 проц., вызначалі-ж мы рост на 11 проц. Аграмаджаны сэктар соцыялістычнай гаспадаркі ў збожжазагатоўках дае нам адну трэцюю частку агульнага ліку загатоўленага збожжа, расьце і будуецца нацыянальная пролетарская культура. На аснове суцэльнай колектывізацыі ажыцьцяўляецца лёзунг партыі — ліквідацыя кулацтва, як клясы.

Гэтыя лічбы зусім яскрава сьведчаць аб тым, што дзякуючы няўхільнаму правядзеньню генэральнай лініі партыі, дзякуючы ўпартай штодзённай барацьбе з правай небясьпекай, як галоўнай, з рознага роду троцкісцкімі і паўтроцкісцкімі элемэнтамі, якія маскуюцца пад псэўда-рэволюцыйнай фразай, а за апошні час блёкуюцца з правымі,—мы здолелі дасягнуць такіх велізарнейшых посьпехаў. Гэтыя лічбы разьбіваюць ушчэнт тэорыі кулацкіх агэнтаў правых ныцікаў і іх саюзьнікаў—„левых“ ухілістых.

Ня гледзячы на агромністыя дасягненьні, мы яшчэ маем і шэраг недахопаў, шэраг цяжкасьцяй—цяжкасьці росту, якія пролетарыят пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі ўпарта перамагае. Паданыя лічбы вельмі ярка сьведчаць аб магутным соцыялістычным будаўніцтве, якое зараз адбываецца ў Савецкай Беларусі, як у неадлучнай частцы Савецкага Саюзу і пры дапамозе пролетарыяту СССР.

Партыя не застановіцца на гэтых дасягненьнях.

Мы ўпарта будзем рухацца наперад па будаўніцтву соцыялізму. Нашы велізарнейшыя посьпехі павінны быць выкарыстаны для далейшага соцыялістычнага будаўніцтва, будаўніцтва нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зьместу культуры.

Наша партыя ніколі не разглядала нацыянальнае пытаньне асобна ад пролетарскай рэволюцыі. Тав. Сталін у свой час падкрэсьліў, што нацыянальнае пытаньне ёсьць неадлучная частка пытаньня пролетарскай рэволюцыі. Адсюль зусім відавочна, што посьпехі соцыялістычнага будаўніцтва ў БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, маюць міжнароднае значэньне, бо яны, узмацняючы соцыялістычную бацькаўшчыну СССР, набліжаюць міжнародную пролетарскую рэволюцыю.

Пленум асабліва падкрэсьліў, што **„бальшавіцкае рашэньне нацыянальнага пытаньня партыя праводзіла ў барацьбе на два фронты: супроць аўстрамарксысцкага, бундаўскага рашэньня нацыянальнага пытаньня і ў барацьбе з Люксэмбургіянцтвам. Бунд высоўваў лёзунг культурна нацыянальнай аўтономіі, што азначала адмаўленьне ад барацьбы за самастойнае дзяржаўнае ўпарадкаваньне прыгнечаных імпэрыялізам нацый, змазваньне клясавых супярэчнасьцяй унутры нацый і тым самым адмаўленьне ад клясавай барацьбы наогул. Бундаўскі лёзунг культурна-нацыянальнай аўтономіі быў выразам дробна буржуазнага нацыяналізму, які выплываў фактычна з устаноўкі аб адзінстве нацый Люксэмбургіянства у тым ліку і расійская яго рознавыгляднасьць (Пятакоў, Бухарын) пад прыкрыцьцём „левай“ фразы і скачваючыся на позыцыі нігілізму ў нацыянальных пытаньнях, вяло барацьбу за адмаўленьне ад лёзунгу права нацый на самавызначэньне, высоўваючы замест яго то патрабаваньне „далоў межы“, то агалашэньне права працоўных усіх нацый на самавызначэньне. Об'ектыўна люксэмбургіянцтва адзначала вялікадзяржаўнае шовіністычнае рашэньне нацыянальнага пытаньня“.**

Адсюль зусім зразумела, што партыя на ўсім сваім гістарычным этапе вяла і вядзе ўпартую барацьбу за бальшавіцкае правядзеньне нацыянальнай політыкі, супроць усялякіх ухілаў. XVI партзьезд адзначыў, што мы маем „у сувязі з абвастрэньнем клясавай барацьбы ў краіне, актывізацыю ў шэрагах партыі нацыянальных ухілаў у бок вялікадзяржаўнага і мясцовага шовінізму“.

Д. А.

(Працяг будзе)

Усю энэргію на дапамогу партыі і комсамолу

За поўнае выкананьне вытворчых праграм на фабрыках, заводах, колгасах, саўгасах, за організацыю працы па прыліву ў колгасы, за ўсеагульнае навучаньне

Дзяржаўнае заданьне піонэрорганізацыі ад ЦВК БССР

У СССР, на адной шостай частцы ўсяе зямное кулі, рабочая кляса пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі будуе новае жыцьцё, будуе соцыялізм. Нябывалымі тэмпамі разгортваецца прамысловасьць. Растуць новыя фабрыкі і заводы, перабудоўваецца сельская гаспадарка на соцыялістычных падставах. Увага ўсяе партыі і рабочае клясы накіравана на пасьпяховае выкананьне 5-ці годкі ў чатыры гады.

ЦК УсеКП(б) у сваёй адозьве ад 3-га верасьня 1930 г. аб прарывах у выкананьні прамфінпляну 2-га году 5-ці годкі заклікаў усіх пролетараў нашай краіны, усе організацыі накіроўваюць свае сілы на выкананьне 2-га году 5-ці годкі для бальшавіцкай сустрэчы 3-га году.

Выкананьне гэтай вялізарнай важнасьці справы патрабуе напружаньня ўсіх сіл рабочае клясы, партыі, комсамолу, усіх працоўных.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР заклікае Вас, юных ленінцаў, ня раз ужо паказаўшых сваю адданасьць справе рабочае клясы і запаветам Ільліча, Вас—верных памоцнікаў партыі і комсамолу—накіроўваць усю сваю энэргію на дапамогу партыі і комсамолу ў барацьбе за поўнае выкананьне вытворчых праграм на фабрыках, заводах, у колгасах, саўгасах, за організацыю працы па прыліву ў колгасы, за ўсеагульнае навучаньне, ліквідацыю няпісьменнасьці, політэхнізацыю школ.

ЦВК БССР зварочваецца да піонэрорганізацыі Беларусі з прапановай выканаць наступнае:

1) Піонэры павінны праверыць выкананьне абавязкаў, узятых на сябе фабрыкамі, заводамі, колгасамі і саўгасамі ў вынік адозвы ЦК УсеКП(б), устанавеце штодзённы нагляд за ходам выкананьня вытворчых праграм, асобнага ўдарнага кварталу па цэхах, асобных варштатах, апавяшчайце ўсіх рабочых аб выніках выкананьня пляну шляхам організацыі дошак са зводкамі, дыяграмамі і г. д.

2) Праверце выкананьне соцумоў з сваімі бацькамі па ўдарнай працы па павялічэньне вытворчасьці працы, на зьніжэньне сабекошту, дапаўняйце дагавары новымі пунктамі.

3) Старэйшыя зьвеньні, вазьмеце шэфства над цэхамі, паасобнымі варштатамі для нясеньня рэгулярных дзяжурстваў па выкананьню падсобнай работы ў цэхах (разгрузка цэхаў ад лёгкай тары, падноска лёгкіх матар'ялаў, дапамога паасобным рабочым у атрыманьні і здачы інструмэнтаў і г. д.).

4) Устанавеце штодзённую праверку дзейнасьці буфэтаў, сталовак і ларкоў, якія абслугоўваюць рабочых на прадпрыемстве, вазьмеце шэфства над рабочай сталоўкай па нагляду за чыстатою, парадкам, культурным абслугоўваньнем рабочых.

5) Працягвайце піонэрскі бой з лятунамі, дэзэртырамі з фронту соцыялістычнага будаўніцтва, дабівайцеся пагалоўнага самазамацаваньня рабочых на вытворчасьці да канца пяцігодкі.

6. Організуйце масавыя зборы рабочых прапаноў для рацыяналізацыі вытворчасьці, сачэце за іх выкананьнем.

7) Разгарнеце самую шырокую кампанію за вярбоўку новых ударнікаў і за стварэньне новых ударных брыгад імя „3-га году" 5-ці годкі.

8) Піонэры, разам з бацькамі ўдзельнічайце ў распрацоўцы кантрольных лічбаў і выпрацоўцы сустрэчнага прамфінпляну вытворчасьці, з ключайце генэральныя ўмовы па соцыялістычнаму спаборніцтву атрадаў з прадпрыемствам.

ЮНЫЯ ЛЕНІНЦЫ— У веснавую пасеўную кампанію НКЗем БССР даручыў Вам вялікую справу,—удзел у перабудове вёскі (заданьне па ўдзелу ў веснавой с.-гаспадарчай кампаніі). Урад добра ведае аб тых справах, як я прарабіла піонэр-організацыя па выкананьню абавязкаў, ён ведае, што побач з вялікімі посьпехамі, піонэр організацыя ня выканала шэрагу ўзятых на сябе абавякаў, і таму ўрад зварочваецца да Вас з прапановай праверыць выкананьне заданьня НКЗему і накіраваць усю сваю ініцыятыву на выкананьне дзяржаўнага заданьня па організацыі новага прыліву ў колгасы

1) Правядзеце шырокую растлумачальную работу аб перавазе колектыўнай гаспадаркі над гаспадаркай аднаасобніка, распаўсюджвайце конкрэтныя дасягненьні колектыўнага гаспадараньня, удзельнічайце ў разьмеркаваньні ўраджаю колгасаў і популярызуйце прыбыткі ад ураджаю,—гэтым самым Вы дапаможаце ўрадзе разьбіваць кулацкую хлусьню аб колгасах.

2) Памятайце, што ваш абавязак дапамагчы вырашыць мясную проблему. Кожны атрад выгадуй адну сьвінаматку, халадняк-цялят і парасят у індывідуальным сэктары. Кожны піонэр даглядай за жывёлай у сябе дома. Атрад, бяры шэфства над сьвінарнікамі па ўборцы і чыстцы жывёлы і хлявоў, будаўніцтву 3-х хлявоў, ацяпленьнем 5-ці хлявоў.

3) Організуйце ўсёю піонэрорганізацыяй Беларусі 400 дзіцячых птушніцкіх таваў і 300 трусагадоўчых, а таксама разгарнеце шэфства над усімі птушкаводнымі гаспадаркамі колгасаў, саўгасаў.

4) Зрабеце 1000 кармушак, наглядайце за правільным доглядам за жывёлай.

5) Заключайце генэральныя ўмовы з колгасьнікамі на лепшую работу ў колгасах, на барацьбу з прагульшчыкамі, недысцыплінаванасьцю, зьбірайце прапановы колгасьнікаў на лепшую організацыю працы ў колгасах.

6) Дапамажэце ў контрактацыі продукцыі, сачэце за своечасовай здачай яе краіне.

7) Кожны атрад павінен дабіцца ад колгасаў, саўгасаў і індывідуальнага сэктару пашырэньня пасеўплошчы асноўных культур (лён, бульба, гародніна).

Ва ўмовах разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва пытаньне культурнай рэволюцыі набывае асаблівае значэньне, таму ЦВК высоўвае перад піонэрорганізацыяй наступныя практычныя задачы:

1) Сіламі піонэраў ліквідуйце няпісьменнасьць сярод 50000 дарослых.

2) Праверце ці ўсе дзеці ад 8-гадовага ўзросту ахоплены школамі, дабівайцеся іх уцягненьня.

3) Дабівайцеся, каб 100 проц. дзяцей беднаты былі з 6 сьпечаны вопраткай і абуткам, каб ва ўсіх школах былі організаваны гарачыя сьнеданьні.

4) Прасачэце за выкананьнем пастаноў політэхнічных зьездаў. Організуйце ў кожным раёне тэх. с.-г. станцыі.

5) Організуйце 300 вучэбных цэхаў на вытворчасьці.

6) Сіламі піонэраў організуйце 500 рабочых пакояў у масавых школах.

7) Праз заключэньне соцыялістычных умоў з сваімі бацькамі завярбуйце 500 рабочых для кіраўніцтва майстэрнямі ў школах.

Піонэрорганізацыя, прыняўшы актыўны ўдзел у перавыбарах саветаў у мінулым годзе, паказала сябе актыўным барацьбітом з клясавымі ворагамі, якія імкнуцца пралезьці ў саветы, каб перашкодзіць нашаму соцыялістычнаму будаўніцтву.

Выходзячы з гэтага, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт заклікае вас—Юных Ленінцаў,—на падставе вопыту мінулага году, прыняць актыўны ўдзел у перавыбарах саветаў.

Усім савецкім органам садзейнічаць выкананьню дзяржаўнага заданьня піонэрорганізацыі Беларусі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

Ад імя піонэрскай організацыі БССР дзяржаўнае заданьне прынята Цэнтральным Бюро Дзіцячых Комуністычных Організацый.

Старшыня ЦБ ДКА пры ЦК ЛКСМБ **ГАЙДУКЕВІЧ.**

Перазаключэньне колдагавароў—важнейшае пытаньне дня

Лісты газэты „Чырвоная Зьмена" рапартуюць:

Бюлетэнь падрыхтоўкі і перазаключэньня колдагавароў

№ 5 | Выдаецца раз у 5 дзён | № 5

Праверка старых колдагавароў падыходзіць к канцу. Зараз па цэлым шэрагу прадпрыемстваў разгортваецца праца па перазаключэньню і складаньню новых колдагавароў.

Слабое месца ў правядзеньні гэтай кампаніі—збор рабочых прапаноў. Замест уважлівых адносін і конкрэтнага скарыстаньня гэтых прапаноў гэтаму пытаньню не ўдзеляюць належнай увагі.

Комсамольскі колектыў Белжылсаюзу прыняў актыўны ўдзел у колдагаворнай кампаніі.

Колектыў Віцебскай абутковай фабрыкі імя Лекерта ганебна цягнецца ў хвасьце.

Разьбіць опортуністычную стаўку на самацёк, організаваць масы рабочае моладзі на лепшы ўдзел у складаньні новых колдагавароў, якія зьяўляюцца ўзаемнымі абавязацельствамі рабочых і адміністрацыі,—вось умовы для больш пасьпяховага складаньня і выкананьня новых колдагавароў, організацыі працы па выкананьню плянаў 3-га году пяцігодкі.

Менскі скурзавод „Бальшавік"

Скончылася праверка выкананьня старога колдагавору. Брыгады выявілі шэраг фактаў невыкананьня колдагавору як з боку адміністрацыі, так і рабочых.

Адміністрацыя да гэтага часу не ўстанавіла вэнтылятары, не зважаючы на тое, што на гэта былі адпушчаны спэцыяльныя сродкі. Па ўсіх цэхах выдаецца недобраякасная спэцвопратка. У барабанным аддзяленьні хромавага цэху бываюць выпадкі звыштэрміновай працы.

Рабочыя ня выканалі пунктаў дагавору па двух галоўнейшых паказчыках. Зьніжэньне сабекошту праведзена толькі на 7 проц., замест плянавых 11 проц. Вытворчасьць узьнялася толькі на 93,58 проц. Перавыдаткі па зарплаце выражаецца ў суме ... рублёў, што дае супроць пляну ... проц. Прагулы ў першым квартале складаюць 0,21 проц., у другім квартале—0,3 проц., у трэцім квартале 0,82 проц., у чацьвертым квартале 0,51 проц. Такім парадкам некаторая частка рабочых ня выканала колдагавору.

Зараз разгортваецца праца па заключэньню колдагавору.

Рабочыя ўносяць шэраг карысных прапаноў.

З. Мін...

Будаўнічы аддзел Белжылсаюзу

Праверка колдагавору пачалася са значным спазьненьнем. Пр... саюзныя організацыі доўгі час бязьдзейнічалі і толькі ў апошні... заварушыліся.

Колектыў ЛКСМБ БЖС вылучыў на сваім сходзе і пасля... пабудовы брыгады для праверкі выкананьня колдагавароў.

11 кастрычніка на сходзе моладзі былі вылучаны спэцыяльныя брыгады з рабочае моладзі, якія распачалі сваю працу.

Б. В.

Віцебская абутковая фабрыка імя Лекерта

Праверка колдагавору на фабрыцы распачалася. Уся праца праходзіць бяз удзелу комсамольскай організацыі. У брыгадах па праверцы ўдзельнічае толькі 5-6 комсамольцаў, тады як колектыў ядн ае 200 чалавек.

На сходзе колектыву і цэхячэек ні разу не абгаварвалася пы... не аб удзеле комсамолу ў ... важнейшай політычнай кампа...

Д. ...

„Міралюбівыя" манэўраваньні імпэрыялістых

Прамова тав. Літвінава

ЖЭНЭВА, 12. На сэсіі падрыхтоўчай камісіі ў конфэрэнцыі па разбраеньню працягваюцца спрэчкі па пытаньню аб абмежаваньні ваенных матар'ялаў.

Пасьля выступленьня дэлегата Чэха-Славакіі Фірлінгера ў спрэчках выступіў галава савецкай дэлегацыі, Нарком замежных спраў тав. Літвінаў, прамова якога была выслухана з вялікай увагай.

Тав. Літвінаў пачаў сваю прамову напамінаньнем, што ён на першым-жа паседжаньні высунуў прапанову—пераглядзець пытаньне аб сухапутных ваенных матар'ялах і затым констатаваў, што з заяў Марынса (Італія) і Сэсіля (Англія) „нельга ня ўгледжваць некаторай перамогі грамадзкай думкі, якая ясна разумее немагчымасьць разбраеньня без скарачэньня ваенных матар'ялаў".

Тав. Літвінаў іраічна напамінае, што на мінулагодніх паседжаньнях як быццам ня было адкрытых праціўнікаў скарачэньня ўзброеньняў. Спрэчкі ішлі тагды, галоўным чынам, па пытаньню ці скарачаць ваенныя матар'ялы прамым шляхам, ці ўскосна—абмежаваньнем бюджэтаў. А так як стораны адна другую не пераканалі, што камісія не знайшла лепшага рашэньня, як адмовіцца ад усякага скарачэньня, **тав. Літвінаў** далей падкрэсьлівае, што бюджэтнае абмежаваньне выгадна слабым у індустрыяльных адносінах краінам, інтарэсы якіх павінны быць асоба абмежаваны конфэрэнцыяй. Гэта няўдобства можна зьменшыць у значнай меры простым пералічэньнем узброеньняў вайны, падлягаючых скарачэньню паўсюдна.

Таму савецкая дэлегацыя прапануе і будзе прапаноўваць падрабязьнейшую дэталізацыю матар'ялаў па разброеньні.

Аднак, для савецкай дэлегацыі не стаіць пытаньне аб выбары аднаго з двух мэтодаў, бо яна цалкам адстаівае адначасовае зьдзяйсьненьне двух, каб яны компэнсавалі адзін другога, паколькі ніводны не здавальняе поўнасьцю. Савецкая дэлегацыя ідзе далей. Яна сьцьвярджае, што найбольш поўны кантроль даў-бы прыняцьце сярэдняга мэтаду, а менавіта мэтаду скарачэньня абучаных рэзэрваў.

На шляху да грандыёзнага фінансавага краху

ВАРШАВА, 13. Лідэр нацыянал-дэмократаў Дмоўскі выступіў у друку з першым артыкулам з цыклю артыкулаў, аб'яднаных агульным загалоўкам „гаспадарчыя небясьпекі". Дмоўскі ў гэтым артыкуле піша:—„Ня трэба даводзіць, што Польшча знаходзіцца ў стане выключна цяжкага крызісу. Гэты стан можа прывесьці да грандыёзнага фінансавага краху. Сучаснае становішча ў Польшчы не зьяўляецца звычайным крызісам, які хутка праходзіць. Калі Польшча, ня прымаючы ніякіх захадаў, будзе чакаць раскачваньня агульна-эўропэйскага крызісу—справа скончыцца для яе разарэньнем".

50 комуністых пакарана сьмерцю

НЬЮ-ЕРК, 12. Амэрыканскі друк публікуе шэраг тэлеграм аб актыўнай дзейнасьці комуністых у Бразіліі, а таксама аб урадавых рэпрэсіях супроць комуністых.

„Чыкаго Дэйлі Ньюс" паведамляе, што нядаўна пакарана сьмерцю 50 комуністых. Дакладнае ўяўленьне аб тым, што адбываецца ў Бразіліі, нельга сабе скласьці па гэтых вестках з прычыны лютасьці цэнзуры.

Бастуе 20 тысяч рабочых

ПАРЫЖ, 13. Як паведамляе „Юманітэ", усеагульная стачка мэталістых у Мадрыдзе ахапіла 15000 рабочых. Мясцовы гарнізон Мадрыда прыведзен у баявую гатоўнасьць. У даліне Ляндзе выбухла забастоўка, якой ахоплена 5000 шахцёраў.

Адказны рэдактар
Рэднол...

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Гал оўлітбел № 50...